сиональных качеств. Опыт работы кафедры хореографии показывает, что редкий музыкант обладает несколькими из перечисленных качеств одновременно, чаще преобладает какое-то одно (следует подчеркнуть, что ни одно учебное заведение страны не готовит концертмейстеров для хореографии).

Задачу повышения квалификации концертмейстеров может решить создание в БГУКИ специализированных курсов повышения квалификации. В штате университета достаточно грамотных специалистов, способных разработать уникальную программу концертмейстеров для хореографии, и достаточно талантливых преподавателей для обеспечения работы на этих курсах.

Повышение квалификации концертмейстеров может осуществляться в январе и в июне, в месяцы, когда за редким исключением нет занятий по расписанию. Программа должна включать два основных направления: работа с «живой музыкой» и с компьютером. Преимущество в плане должно быть отдано индивидуальным занятиям, такая форма позволяет уделить каждому слушателю больше внимания и обеспечивает индивидуальный подход. При успешном запуске курсы могут осуществлять внешнюю деятельность – готовить специалистов для Минска и других городов Беларуси.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**А. Т. Каліноўская,** *вядучы спецыяліст аддзела інфармацыйна-аналітычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых ІПКіПК*

## НАВУЧАННЕ ПРАКТЫКАМ ЗАХАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ ТАНЦАВАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ У СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

Беларуская традыцыйная танцавальная культура надзвычай багатая і разнастайная. Вякамі беларускі народ ствараў мноства яркіх, самабытных, змястоўных і разнастайных па форме танцаў. У танцавальнай творчасці праз яскравыя мастацкія вобразы выяўляюцца тыповыя народныя рысы і асаблівасці характару, перадаюцца думкі, пачуцці, настрой, адносіны да

розных жыццёвых з'яў. Такое выразнае, эмацыйнае пражыванне рэчаіснасці не страціла актуальнасці ў сучасным свеце і застаецца запатрабаваным не толькі пры выхаванні дзяцей і моладзі, але і для разнастайных форм дадатковай адукацыі дарослых. Менавіта традыцыйны народны танец дазваляе далучыцца і праявіць сябе людзям любога ўзросту, розных мастацкіх здольнасцей, фізічнай падрыхтоўкі і прафесійных кампетэнцый.

Узоры танцаў могуць быць пераняты ў сваёй мясцовасці ад старэйшых. Сёння яшчэ можна сустрэць носьбітаў традыцыі, якія пры адпаведных умовах змогуць узгадаць і паказаць тыя танцы, папулярныя на танцавальных вечарынах падчас іх маладосці. Бо танцавальныя вечарыны з жывой музыкай і багатым мясцовым танцавальным рэпертуарам ладзіліся ў сельскіх клубах і дамах вяскоўцаў да пачатку 70-х гг. XX ст. Можна смела сказаць, што традыцыя не забыта і не страчана, і аднаўляць яе можна не толькі з этнаграфічных запісаў і кніг. Гэта асабліва важна таму, што пераймаюцца не толькі рухі. Людзі імкнуцца падзяліцца сваімі пачуццямі, настроем, з якім яны танцавалі, расказаць пра характар кожнага танца, яго асаблівасці, правілы выканання. Узаемаадносіны з носьбітамі – вельмі важны момант у пераемнасці традыцыі. Стварыць адпаведную атмасферу дапамагаюць добры гарманіст ці музычная капэла, пачастункі, гутаркі. Такое творчае ўзаемадзеянне між пакаленнямі каштоўнае для любога ўзросту.

Маляўнічая і разнастайная народная харэаграфія ўключае шматлікія жанры народнага танцавальнага мастацтва. У жывой традыцыі дайшлі да нас розныя варыянты пабытавых танцаў, часцей за ўсё, гэта парныя танцы, полькі, сольна-гуртавыя варыянты «Барыні», «Рускага», «Лявоніхі». Радзей можна сёння сустрэць цалкам выкананыя шматфігурныя танцы – мясцовыя кадрылі і іх варыянты «Лянцей», «Нажнічкі», «Шэн», парнагуртавыя полькі і інш. Такія танцы захаваліся дзякуючы ўважлівым да спадчыны свайго краю работнікам мясцовых устаноў культуры і фальклорным гуртам, якія надалі танцам новае жыццё. Статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці нададзены «Котчынскай кадрылі» з Мастоўскага раёна і «Дэмбраўскай кадрылі» са Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, а таксама «Спораўскай польцы» з Бяро-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заўскага раёна Брэсцкай вобласці. Аднаўляюць мясцовыя кадрылі ў Талачынскім, Сенненскім і іншых раёнах Віцебшчыны, у Любанскім раёне на Міншчыне.

Парныя танцы – самыя шматлікія і найбольш папулярныя сёння. Сярод іх можна вылучыць як традыцыйныя беларускія («Лявоніха», «Мяцеліца», «Каваль», «Верабей» і інш.), так і вялікую колькасць асіміляваных танцаў, якія выконваюцца пад мелодыі, што прыйшлі з суседніх краін. За даволі працяглы час бытавання на нашай тэрыторыі танцы набылі ўсе асаблівасці мясцовай народнай харэаграфіі, і іх прынята разглядаць як беларускія танцы. Чым раней танец з’явіўся на нашай зямлі, тым больш мясцовых варыянтаў узнікла. Часта адрозненні прасочваюцца ад вёскі да вёскі. Таму заўсёды цікава не толькі вывучыць агульнавядомыя вырыянты, але і знайсці мясцовыя. Многія этнаграфічныя рэгіёны маюць свае асаблівасці танцаў «Кракавяк», «Гапак», «На рэчаньку», «Ночка», «Субота», «Ойра» і інш. Гарадскія побытавыя танцы, што прыйшлі ў вёску праз гарадское асяроддзе, таксама зазналі моцны ўплыў народнай харэаграфіі і захавалі толькі некаторыя выразныя асаблівасці свайго паходжання, якія можна заўважыць у такіх танцах, як «Карапет», «Базар», «Субота», «Каханачка», «Падыспань». У ХХ ст. актыўна засвоіваліся ў народным асяроддзі вальс, факстрот, танга. Усе гэтыя танцы з простым і цікавым харэаграфічным малюнкам дазваляюць хутка далучыць і зацікавіць як слухачоў, якія засвойваюць адукацыйную праграму курсаў павышэння кваліфікацыі, прыватных навучальных курсаў, так і ўдзельнікаў асобных майстар-класаў, а таксама шырокую публіку падчас святаў і імпрэз. Дарослая аўдыторыя з такім жа захапленнем, як і маладзёжная, або дзіцячая, далучаецца да гуртавых танцаў-гульняў, танцаў тройкамі або са зменай пар («Юрачка», «Явар», «Цяцерка», «Лявоніха» – тройкамі, «Падыспань» – са заменай пар і інш.).

Каб захаваць усё багацце традыцыйнай танцавальнай культуры неабходна надаць увагу майстэрству імправізацыі. Імправізаваныя формы танцаў, якія ствараюцца спантанна ў працэсе выканання, у Беларусі называюцца скокамі і існуюць у парным, сольным, сольна-гуртавым выкананні. Сярод іх сустракаюцца старажытныя адметныя беларускія скокі «Мікіта», «Таўкачыкі», «Каза», «Жабка». Прастор для імправізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даюць шматлікія полькі, розныя варыянты «Барыні», «Рускага» і інш. Здольнасць да танцавальнай імправізацыі праяўляецца ў атмасферы творчай свабоды, эмацыянальнага ўздыму, разняволенасці, якая вядзе да жадання выказаць сябе праз сольны танец. Менавіта такія ўмовы імкнуцца стварыць арганізатары конкурсаў беларускіх танцаў, што праводзяцца як на рэспубліканскім узроўні ў рамках фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», так і на мясцовым у многіх абласцях і раёнах краіны. Часцей за ўсё ўдзельнікамі конкурсаў становяцца дзеці, але групы дарослых танцораў таксама ствараюць эфектныя часткі праграмы, асабліва калі атрымліваецца заахвоціць да ўдзелу людзей старэйшага пакалення, носьбітаў традыцыі.

Крыніцай нефармальнай адукацыі для дарослых паступова становіцца ўся разнастайнасць традыцыйнай культуры, сярод якой танцавальная творчасць здольна аб'яднаць розныя накірункі творчай адукацыі ў галіне народнага мастацтва. Многія з тых, хто зацікавіўся народным танцам, пачынаюць паступова асвойваць і іншыя жанры традыцыйнай культуры: фальклорныя спевы, інструментальную музыку, асновы рамёстваў па вырабу строяў, каляндарна-абрадавыя практыкі свайго рэгіёну.

У Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў навучанне практыкам захавання традыцыйнай танцавальнай культуры запатрабавана ў рамках навучальных курсаў «Фальклорна-абрадавыя традыцыі ў структуры культурна-адпачынкавай дзейнасці» (для метадыстаў метадычных цэнтраў народнай творчасці (культурна-асветнай работы), клубных арганізацый), «Арганізацыя вольнага часу рознаўзроставых катэгорый насельніцтва» (для мастацкіх кіраўнікоў клубных арганізацый), «Сацыякультурны менеджмент і тэндэнцыі развіцця сферы вольнага часу» (для дырэктараў, намеснікаў дырэктараў, начальнікаў структурных падраздзяленняў клубных арганізацый).

Відавочна, што глыбокае спасціжэнне традыцыйнай танцавальнай культуры, усёй разнастайнасці лексікі народнага танца немагчыма на працягу кароткага курсу заняткаў. Невялікая навучальная праграма ці серыя майстар-класаў звычайна мае на мэце знаёмства з найбольш папулярнымі варыянтамі танцаў, разнастайнасцю танцавальнай спадчыны, магчымасцямі яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстання ў культурна-адпачынкавых праграмах, заахвочванне да самастойнай арганізацыі танцавальных заняткаў ці вывучэння мясцовых танцавальных традыцый.

Захаванне традыцыйнай танцавальнай культуры магчыма праз прымяненне розных форм навучання ў рамках клубаў, гурткоў, студый, трэнінгаў. Для мэтаў актуалізацыі вынікаў навучання мэтазгодна арганізацыя конкурсаў, фестываляў, удзел у святах і канцэртах, якія таксама можна аднесці да масавых культурна-дасугавых формаў дадатковай адукацыі.

На падставе заняткаў з моладдзю і дарослымі, абмену досведам з тымі, хто прымяняе практыкі асваення і захавання традыцыйнай танцавальнай культуры, можна зрабіць вынік, што яны паспяхова выконваюць функцыі, якія мае дадатковая адукацыя дарослых. Гэта забеспячэнне фізічнага, эмацыйнага, творчага развіцця асобы, авалоданне практычнымі ўменнямі для паўнацэннага, творчага, прыгожага жыцця, забеспячэнне якаснага ўзроўню рэлаксацыі і сацыялізацыі чалавека ў сучасным грамадстве.

1. *Алексютович, Л. К.* Белорусские народные танцы, хороводы, игры / Л. К. Алексютович. – Минск : Выш. шк., 1978. – 530 с.

2. *Выскварка, С. Г.* Беларускі танцавальны фальклор : методыка працы з дзіцячым калектывам / С. Г. Выскварка. – Мінск : Зміцер Колас, 2015. – 82 с.

3. Дополнительное образование взрослых: опыт программно-методического обеспечения / сост. С. И. Тарарышко. – Минск : Пропилеи, 2012. – 220 с.

4. *Осовская, Г.* Мария Лоханина: «Социальные танцы дарят личную гармонию и счастье» / Г. Осовская. – Дом культуры. – № 12. – 2016. – С. 4–9.

5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Выш. шк., 2010. – Т. 5 : Цэнтральная Беларусь : у 2 кн., кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.] ; ідэя і агульнае рэдагаванне Т. Б. Варфаламеева. – 911 с.

5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Минск : Выш. шк., 2013. – Т. 6 : Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн., кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.] ; ідэя і агульнае рэдагаванне Т. Б. Варфаламеева. – 1231 с.

6. *Чурко, Ю. М.* Белорусский хореографический фольклор: традиции и современность / Ю. М. Чурко ; вступ. ст. С. В. Гутковской. – Минск : Четыре четверти, 2016. – 388 с.

7. *Чурко, Ю. М.* Вянок беларускіх танцаў / Ю. М. Чурко. – Мінск : Беларусь, 1994. – 88 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ